■ Акцэнт на здароўе

УСЁ Ў НАШЫХ РУКАХ

Траўмаў кісці становіцца менш, але яны з кожным годам цяжэйшыя

Людзі кажуць: «Усё ў нашых руках». Сапраўды, штодзень у далоні кожнага з нас трапляе вялікая колькасць рэчаў, розных па памеры, форме і прызначэнні. Таму нашы рукі, дарэчы, часта і знаходзяцца пад найвялікшай пагрозай траўміравання. Цяпер настала пара зімовых свят, адзін з атрыбутаў якіх — феерверкі і петарды. Прыгожыя, але не заўсёды бяспечныя, яны могуць цалкам перавярнуць нашы планы на першыя дні і нават месяцы новага года. Добра, калі не на ўсё жыццё. У навагоднюю ноч спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра хірургіі кісці, які дзейнічае на базе 6-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска, заўсёды напагатове. Як бачацца зімовыя святы з гэтай медыцынскай установы, нам расказаў урач траўматолаг-артапед вышэйшай катэгорыі Уладзімір МАЛЕЦ.

— Уладзімір Леанідавіч, ці многа да вас звяртаецца людзей з траўмамі рук ад піратэхнікі?

— Год на год не прыходзіцца, аднак за ўвесь святочны перыяд звычайна паступае больш за дзясятак чалавек з траўмамі ад піратэхнікі. Прычым ёсць дрэнная тэндэнцыя, што з такімі пашкоджаннямі ўсё часцей звяртаюцца менавіта дзеці і падлеткі. Апошнім часам колькасць пацярпелых меншая, але характар траўмаў становіцца цяжэйшы: калі раней гэта былі ў большасці раны, кантузіі, то цяпер даходзіць да адкрытых пераломаў, адчляненне сегментаў кісці, якія патрабуюць сур'ёзных аперацый і працяглага аднаўленчага перыяду.

— І гэта вынік нізкай якасці піратэхнікі ці няправільнага карыстання ёю?

— Асноўная праблема такога траўміравання ў няправільным карыстанні. Дзецям цікава, што будзе, калі разабраць петарду, падпаліць яе ў руках, часта спрабуюць паўтарыць трукі з інтэрнэту, і зразумела, што ў большасці выпадкаў гэта канчаецца дрэнна.

— А калі ўсё ж такі такое адбылося, якая павінна быць першая дапамога пацярпеламу?

— Вельмі важна як мага хутчэй пастарацца даставіць пацярпелага ў медыцынскую ўстанову. Перад гэтым трэба проста накруціць чысты бінт, не трэба нічога прамываць, спрабаваць спыніць крывацёк, нешта ўправіць. Калі ёсць адчляненне якой-небудзь часткі кісці, то неабходна таксама абкруціць руку бінтам, абгарнуць яе пакетам і змясціць у яшчэ адзін пакет з ільдом. Можна змайстраваць імправізаваную шыну з дошчачкі, напрыклад.

— Уладзімір Леанідавіч, чаму хірургія кісці выдзелена як асобная галіна?

— Нездарма вялікі кісцевы хірург Стэрлінг Бунел назваў хірургію кісці брыльянтам артапедычнай хірургіі: чалавечая рука — гэта вельмі складаная канструкцыя з мышцаў, нерваў, касцей, суставаў. Да таго ж усім вядома, што праца ператварыла малпу ў чалавека, а працоўная дзейнасць чалавека немагчымая без нармальнага функцыянавання кісці.

— Цэнтр, у якім вы працуеце, у Беларусі адзін. Значыць, людзей з любымі траўмамі і хваробамі кісці вязуць сюды з усёй краіны?

— У Мінск з рэгіёнаў вязуць найчасцей не з пашкоджаннямі, а з захворваннямі. Таму што калі траўма вострая, то везці сюды не заўсёды правільна. Як правіла, частку функцый на абласным узроўні бяруць на сябе аддзяленні мікрахірургіі на базе аддзяленняў абласных бальніц.

— Колькі прыкладна штодзень паступае пацярпелых і які характар траўмаў распаўсюджаны найболей?

— Калі не браць у разлік пацыентаў з артапедычнымі захворваннямі, кожны дзень з траўмамі да нас звяртаюцца ад 20 да 40 чалавек. Гэтая колькасць павялічваецца ў перыяд вясна — восень, калі людзі пачынаюць карыстацца рознымі механізмамі (балгаркамі, таркарнымі станкамі, піламі) і атрымліваюць высокаэнергетычныя траўмы. Чым вышэй навукова-тэхнічны прагрэс, тым вышэй траўматызм. Таму з кожным годам траўмы набываюць усё больш цяжкі характар, і, на жаль, усё радзей кісць паддаецца поўнаму аднаўленню.

— Раскажыце пра нейкія незвычайныя аперацыі, праведзеныя ў цэнтры.

— Любая аперацыя сама па сабе ўнікальная, бо адна і тая ж паталогія ў кожнага мае нейкія свае асаблівасці. Але ёсць шэраг аперацый, якія праводзяцца ў выключных выпадках. Скажам, бывае, што скура здымаецца, як пальчатка. Застаюцца голыя сухажыллі, косці. Тады бяруцца і падшываюцца свабодныя лапікі, гэта значыць праводзіцца шматэтапная скурная пластыка.

«Чым вышэй навукова-тэхнічны прагрэс, тым вышэй траўматызм. Таму з кожным годам траўмы набываюць усё больш цяжкі характар, і, на жаль, усё радзей кісць паддаецца поўнаму аднаўленню».

Адметна тое, што ў нашым цэнтры ажыццяўляецца не толькі лячэбная дзейнасць, але і навуковая. Мы распрацоўваем новыя методыкі, звязаныя з паталогіяй запясця, напрыклад, ужо выкарыстоўваецца методыка лячэння хваробы Кінбэка, артрозу першага запясцевапясцевага сустава, а таксама паталогіі посттраўматычнай дэфармацыі дыстальнага аддзела перадплечча. Цяпер распрацоўваюцца методыкі па лячэнні дабраякасных утварэнняў кісці. Перыядычна вядзецца супрацоўніцтва з кафедрай Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і Беларускай медыцынскай акадэміяй паслядыпломнай адукацыі. Рэгулярна ездзім за мяжу, глядзім новыя методыкі, укараняем іх тут. Пішуцца і абараняюцца кандыдацкія, доктарскія дысертацыі, прысвечаныя траўмам і захворванням кісці. Калі параўноўваць з замежнымі калегамі, можна сказаць, што не сорамна за наш цэнтр.

Аляксандра ДАРАШЭНКА

Извещение о реализации недвижимого имущества ОАО «Барановичидрев», имеющего высокий износ

Первые повторные торги состояться 8 января 2018 года, в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.

Цена всех Лотов №№8–13 установлена ликвидационной комиссией и снижена на 10% от первоначальной цены.

Сумма задатка: 10% от начальной цены Лотов в рублях РБ.

Получатель платежа: 225410, ОАО «Барановичидрев», г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, р/с: BY68BPSB30121226161389330000; БИК BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск; УНН 200299909.

Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.

Заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, по всем ЛОТАМ, в срок до 14.00 04.01.2018 года организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А. М. по адресу: **225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. ВОСТОЧНЫЙ ПОСЕЛОК, 3, ОАО «Барановичидрев».**

Конт. тел. (029) 6332490 vel, (029) 8248026 МТС; факс (0163) 455124;

Emal: mischuk_am@mail.ru

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

Более подробно с условиями аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 28.12.2017 года.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Октябрьского (г. Минска) межрайонного отдела управления по г. Минску и Минской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества:

Сведения о предметах торгов (продаваемом имуществе)				
№ предмета торгов	Наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества	Начальная цена, бел. руб.	Сумма задатка (10% от начальной цены), бел. руб.	Контакт для осмотра объекта
1	Изолированное помещение – квартира 24 с инв. №500/D-76667, общей площадью 40,3 кв. м, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Трудовая, 8-24. **Примечание:** двухкомнатная, жилая площадь – 23,81 кв. м	60 570,00	6 057,00	8 029 648 28 35
2	Изолированное помещение – квартира 90 с инв. №500/D-243101, общей площадью 31,8 кв. м, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Краснослободская, 9/1-90. **Примечание:** однокомнатная, жилая площадь – 16,54 кв. м	56 520,00	5 652,00	8 029 672 57 41

Задатки в размере 10% от начальной цены объектов перечисляются на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015 ОКПО 29250255 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» не позднее 26.01.2018.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 №63.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) **в течение 3 рабочих дней** со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Подробный порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях их проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by**.

Аукцион состоится **30.01.2018 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по указанному адресу. Окончание приема заявлений: **26.01.2018 в 16.00. Телефоны: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

■ Здарэнні

ШОУ З АПЁКАМ

Наведвальніцу салігорскай кавярні шпіталізавалі пасля шоу-праграмы з вадкім азотам. Упраўленнем Следчага камітэта па Мінскай вобласці заведзена крымінальная справа па факце неналежнага аказання паслуг.

«Па папярэдніх даных, вечарам 23 снежня ў адной з салігорскіх кавярняў пасля нумара шоу-праграмы, дзе выкарыстоўваўся вадкі азот, наведвальніцы стала дрэнна. Жанчына была дастаўлена ў рэанімацыю ў цяжкім стане з прыкметамі тэрмічнага апёку. Цяпер ёй аказваецца неабходная медыцынская дапамога, — паведаміла афіцыйны прадстаўнік УСК па Мінскай вобласці Таццяна Беланог. — Следствам канфіскаваныя прадметы і іншыя рэчавыя доказы, якія накіраваны для экспертных даследаванняў, у тым ліку на прадмет устанаўлення небяспечных рэчываў». Высвятляюцца фактычныя абставіны і прычыны таго, што адбылося.

ЗГУБІЛІСЯ ПАДЧАС ШЭСЦЯ ДЗЯДОЎ МАРОЗАЎ

Міліцыянеры дапамаглі вярнуць бацькам трох дзяцей.

У суботу падчас правядзення шэсця Дзядоў Марозаў інспектар па забеспячэнні аховы грамадскага парадку Цэнтральнага РУУС сталіцы капітан міліцыі Дзяніс Прасняк звярнуў увагу на хлопчыка шасці гадоў, які стаяў адзін і плакаў.

— Падышоўшы да яго, супрацоўнік высветліў, што малы прыйшоў на свята са сваёй бабуляй, але ў натоўпе згубіўся. Міліцыянер супакоіў дзіця, узяў яго за руку і разам яны адправіліся на пошукі бабулі. Неўзабаве яна была знойдзена каля гандлёвых палатак. Аказалася, што жанчына ненадоўга адарвалася, купляючы прысмакі, а калі павярнулася, то заўважыла, што ўнука няма. Малы быў перададзены бабулі, з якой супрацоўнікам была праведзена прафілактычная гутарка, — паведаміла **прадстаўнік Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.**

Праз некаторы час да інспектара АГіМ капітана міліцыі Арцёма Глеба звярнулася састарэлая жанчына, якая расказала, што знаходзілася каля ГУМа са сваім 9-гадовым унукам, але згубіла дзіця з вачэй. Арцём Глеб перадаў прыкметы хлопчыка ўсім нарадам, якія неслі службу, і праз некалькі хвілін дзіця было знойдзена каля Палаца спорту.

Праз 20 хвілін пасля таго, што здарылася, супрацоўнікі роты патрульна-паставой службы міліцыі дапамаглі жанчыне, якая прасіла знайсці свайго 5-гадовага сына, якога яна згубіла. Па прыкметах хлопчык быў знойдзены ў лічаныя хвіліны і перададзены ўдзячнай маме.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*